Ljašuk, Vìktoryja Marlenaŭna

# Онімы Скарына і Прага ў беларускім мастацкім тэксце : культуралагічны і стылістычны аспект

*Opera Slavica.* 1999, vol. 9, iss. 4, pp. 16-24

ISSN 1211-7676

Stable URL (handle): https://hdl.handle.net/11222.digilib/117195
Access Date: 28. 11. 2024
Version: 20220831

Terms of use: Digital Library of the Faculty of Arts, Masaryk University provides access to digitized documents strictly for personal use, unless otherwise specified.

MUNI ARTS
Masarykova univerzita
Filozofická fakulta

Digital Library of the Faculty of Arts,
Masaryk University
digilib.phil.muni.cz

# ОНІМЫ *СКАРЫНА І ПРАГА* Ў БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦКІМ ТЭКСЦЕ: КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ І СТЫЛІСТЫЧНЫ АСПЕКТ

**Вікторыя Ляшук (Минск)**

Уласныя імёны, онімы, складаюць частку моўнай камунікатыўнай сістэмы, з'яўляючыся пры гэтым значным міжмоўным пластом лексікі, што не патрабуе перакладу. Кожны з онімаў нясе інфармацыю пра анамастычную прастору мовы, пра сістэму індывідуалізацыі, ідэнтыфікацыі аб'ектаў рэчаіснасці. Найменні, што служаць для вылучэння пэўных, часта адзінкавых рэалій, займаюць асобае месца ў культурным жыцці, маюць свае заканамернасці функцыянавання.

Сярод онімаў існуюць ядзерныя структурныя кампаненты, здольныя канцэнтраваць у сабе каштоўныя фонавыя веды пра жыццё грамадства і пра гістарычных асоб, якія ўплывалі на яго зрухі. У гэтым плане найперш вылучаюцца антрапонімы і тапонімы (айконімы і гідронімы), досыць устойлівыя адзінкі ў анамастыконе кожнага народа на працягу не аднаго гістарычнага перыяду. Яны пры функцыянаванні набываюць значную частотнасць і палівалентнасць, што, як правіла, знаходзіць адлюстраванне ў мастацкай літаратуры.

Такой моўнай адзінкай у беларускім сучасным анамастыконе, бясспрэчна, з'яўляецца ўласнае імя ***Францыск/Францішак Скарына***, належнае да нацыянальнай культурнай традыцыі, мастацкай літаратуры, а паводле сусветнага аўтарытэту названай ім гістарычнай асобы – вядомае іншым народам. У тэкстах беларускай мастацкай Скарыніяны, – як адлюстраванне даўніх сувязей чэшскага і беларускага народаў, – распаўсюджаны ўрбонім ***Прага***. Яго высокая частотнасць звязана з надзвычайным значэннем гэтага культурнага цэнтра Еўропы для дзейнасці беларускага першадрукара.

Прыцягненне онімаў у мастацкі тэкст выклікаецца ўзаемадзеяннем культуралагічных і стылістычных фактараў, якія ў пэўны перыяд грамадскага і літаратурнага развіцця выяўляюцца і рэалізуюцца па-рознаму. Пры гэтым мастацкаму асваенню онімаў папярэднічае іх больш-менш працяглае функцыянаванне ў іншых стылях, за час якога акрэсліваецца напаўненне гэтых адзінак прагматычным зместам, ствараецца глеба для іх

культурна-мастацкага і стылістычнага асэнсавання. Як адзначае Уладзімір Конан, «літаратурна-мастацкае адлюстраванне дзейнасці Францыска Скарыны і яго эпохі пачалося ў перыяд паскоранага развіцця беларускай літаратуры, нацыянальнай самасвядомасці і прагрэсіўнай грамадска-палітычнай думкі – у канцы 19 – пачатку 20 стагоддзя»[1]. Імя ж Скарыны, а таксама і назва чэшскай Прагі ўпамінаюцца ў прыжыццёвых афіцыйных паперах, у Скарынавых прадмовах і пасляслоўях да Бібліі, а з XVII стагоддзя – у навуковых працах. Вядомыя нам сёння дакументы сведчаць, што і пры жыцці Ф. Скарына меў аўтарытэт высокаадукаванага рупнага чалавека. Спатрэбілася тры стагоддзі, каб падрыхтавацца да спасціжэння асобы Ф. Скарыны і яго дзейнасці – глыбока ім усвядомленай і лагічна абгрунтаванай. У сваёй сутнасці Ф. Скарына стаў увасабленнем духоўных здольнасцей і культурных запатрабаванняў Беларусі, таму так арганічна і важка ўвайшоў яго вобраз у беларускую мастацкую літаратуру, а яго ўласнае імя набыло сімвалічнае значэнне, якое перадае ідэал гуманізму, патрыятызму, адукаванасці, нястомнай духоўнай працы і асветніцтва, жыцця на карысць сваёй Бацькаўшчыны.

Культуралагічны аспект ужывання антрапоніма ***Францыск/Францішак Скарына*** вынікае з яго шырокага гісторыка-культурнага фона, які ўключае беларускія і сусветныя рэаліі розных гістарычных часоў. Культурным фактам з'яўляецца падкрэсленне Скарынам свайго аўтарства, што аказала непасрэдны ўплыў на мастацкае выкарыстанне яго імя наступнікамі. Прыклад такога ўжывання дае сам Скарына, паколькі даследчыкі адзначаюць мастацкасць Скарынавага выкладу. Так, у энцыклапедычным даведніку «Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X–XIX стагоддзі», дзе ўсходнеславянскаму першадрукару прысвечаны грунтоўны артыкул аўтарскага калектыву, сцвярджаецца: «На пераклад біблії паўплывала духоўная атмасфера эпохі Адраджэння, своеасаблівы артыстызм і погляд на культуру з эстэтычнага боку»[2]. А. Ф. Коршунаў адзначае: «У літаратурнай творчасці Скарыны раскрыліся не толькі яго рознабаковыя веды, але і яркі талент пісьменніка-публіцыста, выдатнага мастака слова»[3]. Вучоныя звяртаюць увагу на стыль выкладу. Напрыклад, Вячаслаў Чамярыцкі падкрэслівае: «Скарынаў пераклад – не проста літаратурна дасканалы, ён класічны.

[1] *Конан, У. М.*: Францыск Скарына ў мастацкай літаратуры // «Народу свайму ўслугуючы...»/ Уклад. М. Б. Яфімава. Мінск, 1990. С. 11.

[2] *Конан, У. М., Падокшын, С. А., Юхо, І. А.*: Скарына (Скарыніч) Францыск // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Мінск, 1995. С. 130.

[3] *Коршунаў, А. Ф.*: Творчая спадчына Францыска Скарыны // Францыск Скарына. Творы. Мінск, 1990. С. 11.

Стыль яго просты і выразны і адначасна ўмерана ўзнёслы, выклад – натуральны і свабодны, але без адвольнасцей і шматслоўнасці. Яшчэ больш дзелавыя і лаканічныя, змястоўныя і важкія прадмовы першадрукара. У цэлым жа кніга Скарыны – гэта класічна завершаны твор мастацтва, у якім гарманічна, у арганічным адзінстве спалучаны ўсе элементы»[4]. У гэтай гармоніі закладзены асновы мастацкага функцыянавання антрапоніма ***Францыск/Францішак Скарына***, а таксама і ўрбоніма ***Прага***, паколькі вытворны ад яго адносны прыметнік ужываецца ў Скарынавых кнігах пры абазначэнні месца іх выдання: *(Старое) Место* ***Празское.***

Стыль падачы свайго аўтарства Францішкам Скарынам (як выключную культурную з'яву, не характэрную для іншых яго землякоў-творцаў) адзначае Ігнат Дварчанін. Сваё імя і прозвішча першадрукар дапаўняе заслужанымі навуковымі тытуламі (*докторъ; в лекарскихъ наукахъ докторъ, въ лекарстве и въ наукахъ докторъ*), узнёсла-змястоўнымі перыфразамі (*ученыи мужъ, избранныи мужъ*). «Усюды Скарына выступае як моцны аўтарытэт, які шмат ведае, а таму і робіць»[5]. На прыкладзе прадмовы да Кнігі Іова Уладзімір Конан заўважае: «Скарына аб'яўляе сваё аўтарства, сваю кампетэнтнасць, мэту як пісьменніка, выдаўца, асветніка»[6].

У выбары Ф. Скарынам для сваёй выдавецкай дзейнасці Прагі навукоўцы бачаць аб'ектыўную заканамернасць. У іх аргументах пераважаюць культуралагічныя фактары – багаты вопыт перакладаў Святога Пісання; геаграфічная блізкасць да іншых цэнтраў еўрапейскага кнігадрукавання; пашырэнне і развіццё сувязяў паміж тагачаснымі Чэхіяй і Беларуссю. Пры гэтым найважнейшым лічаць тое, што Прага была агульнапрызнаным цэнтрам гусіцкіх ідэй і верацярпімасці, мела багатыя традыцыі кнігадрукавання. Мастацкая інтэрпрэтацыя спыняе ўвагу на апошнім тлумачэнні. Менавіта яго выбірае Алег Лойка ў рамане-эсэ «Францыск Скарына або Сонца Маладзіковае», перадаючы думкі першадрукара: ... *Чым Прага для яго ёсць, ужо цяпер ён ясна разумее: адзіны горад, што даў згоду, пайшоў на дамоўленасць з ім, стаў месцам здзяйснення яго мары*. Антон Ясінскі падкрэслівае, што пры выбары Скарынам менавіта Прагі «ўпэўненасьць у спакоі і бясьпецы мела далёка не апошняе

---

[4] *Чамярыцкі, В. А.*: «...Народу свайму ўслугуючы»// Полымя. 1987. № 8. С. 201.

[5] *Дварчанін, І.*: «Послужити посполитому люду...»// Слаўны сын Беларусі / Уклад. С. С. Панізнік. Мінск, 1994. С. 208.

[6] *Конан, У. М.*: Свет Францішка Скарыны // Полымя. 1990. № 8. С. 187.

значэньне»[7]. Яшчэ адну істотную акалічнасць, узгадваючы друкарскія традыцыі Венецыі, заўважае А. С. Мыльнікаў: «Скарыну магла прыцягваць культурная блізкасць Чэхіі, магчымасць у Празе мець тое асяроддзе, якое, натуральна, адсутнічала ў неславянскай Італіі і якое яму спрыяла плённа займацца перакладчыцкай і выдавецкай працай»[8]. Бясспрэчна, гэтым тлумачыцца асаблівасць Скарынавага стылю ацэначна акрэсліваць месца свайго пляннага кнігадрукавання.

Моўнымі сродкамі ўвасаблення такой інфармацыі абраны складаныя назвы з традыцыйнымі для еўрапейскага красамоўства азначэннямі: *Во славномъ Великомъ Месте Празскомъ*; *у славномъ Старомъ месте Празскомъ* ды інш. Такое шматслоўнае, узнёслае найменне ў сучасных беларускіх мастацкіх тэкстах выкарыстоўваецца досыць абмежавана, у зменены выглядзе – з іншым лінейным размяшчэннем кампанентаў, са скарачэннем іх колькасці: *Не аб пажарах думае сёння ў* ***Старым Пражскім Месце*** *Францыск Скарына; Няхай самога Францішка там сёння няма, ды яму здаецца, што ён – там, што сёння ён лучыць мінулае і сённяшняе, аддаленае і блізкае – лучыць ужо тут, на* ***Старым Пражскім Месце,*** *у адзіным сабе...* (Алег Лойка. Францыск Скарына або Сонца Маладзіковае). Выкарыстоўваецца цытацыя: *А пакуль што Францыск ідзе знаёмымі вулачкамі* ***«вялікага і старога горада»****, як ён з замілаваннем называў у сваіх прадмовах* ***Прагу****, што калісь дала прытулак яму і яго вялікай справе* (Анатоль Клышка. Францыск Скарына, альбо Як прыйшла да нас кніга); *У вясёлай* ***«добрай, старой Празе»*** *завялася рэлігійная падазронасць* (Уладзімір Караткевіч. Вера ў сілу дабрыні, або Сын Беларусі, сын Прагі).

У мастацкіх тэкстах ўжываюцца мадэляваныя маналогі Скарыны, яго дыялагічныя выказванні, у складзе якіх традыцыйныя азначэнні развіваюць урбонім *Прага*: *Майстроў-памочніка ў развеяў вецер// Саўдзельнікам маім усё цяжэй// Пасля* ***славутай Прагі*** *датрымаць// Са мной хаўрус друкарскі...*(Мікола Арочка. Судны дзень Скарыны). У гэтым прыкладзе ацэначнае спалучэнне *славутая Прага*, адзначанае, як і ў Скарыны, павагай і ўзнёсласцю, кантрастуе з пачуццём безвыходнасці і адзіноты ўсяго выказвання, узмацняючы яго эмацыянальнае ўздзеянне.

---

[7] *Ясінскі, А.*: З культурнае гісторыі Чэхіі пачатку XVI-га сталецьця // Чатырохсотлецьце беларускага друку. Менск, 1926. С. 41.

[8] *Мыльнікаў, А. С.*: Ф.Скарына і чэшскае кнігадрукаванне // 450 год беларускага кнігадрукавання. Мінск, 1969. С. 188.

Алег Лойка ў цытаваным вышэй рамане-эсэ прыводзіць арыгінальную інтэрпрэтацыю азначэння *слаўны* (горад), устаноўліваючы семантычныя сувязі паміж прыметнікамі-азначрдннямі *прыгожы – слаўны – вялікі – вечны*, уключае іх у плынь думкі Францыска Скарыны, тоеснай аўтарскаму меркаванню, выбіраючы для гэтага форму няўласна-простай мовы. Пры гэтым дакладна названа месца прысутнасці галоўнага героя – *у Празе, друкарні шматпаважанага Паўла Севярына*. Такі сінтэз мастацкасці і дакладнасці, багацце сінтаксічных сродкаў выражэння логікі мыслення і максімальная канкрэтызацыя высноў паўтарае заканамернасці Скарынавага мыслення, Скарынавага стылю.

Стылістычнай асаблівасцю ўяўляецца і частотнасць форм урбоніма *Прага*, што ўказваюць на прасторавыя адносіны – месца, дзе адбываюцца падзеі, на якое ці ад якога накіравана дзеянне і г. д. Як правіла гэты онім ужываецца без азначэнняў ды іншых сродкаў стылістычнай выразнасці, выконваючы ролю канкрэтызатара паведамлення: *І самае галоўнае ў тым, што не толькі вучнем у друкарскай справе, а паслом ад Максіма Грэка прыйшоў да мяне **ў Прагу** Пётра Мсціславец* (Алесь Петрашкевіч. Напісанае застаецца); *Гэткі сон даглядзець не далі. Каб не званок, то я **ў Празе** даўно быў бы. **У ся-рэд-не-вя-ко-вай Празе**! З Францыскам Скарынам!* (Аляксей Якімовіч. Свята Францыска Скарыны); *...І торба кніг маіх святых, якія// Мне трэба ўратаваць ад пошасці, ад мору,//Што **ў Празе** люта косіць гараджанаў,//А больш за ўсё – ад служак Фердынанда...* (Максім Танк. У Татрах); *Бо з **Прагі** тут нейкі Скарына//Кнігі злаўчыўся вазіць на радзіму,// Якую чамусьці пакінуў* (Янка Сіпакоў. Кантрабанда).

Пашырэнне гісторыка-культурнага плана адбываецца за кошт уключэння ў сказ (на аснове супастаўляльных ці супрацьпастаўляльных адносін) урбоніма *Прага* і (адпаведна звязаным з біяграфіяй Скарыны беларускім рэаліям) урбонімаў *Полацк* ці *Вільня*: *Малы Францішак ведаў, што маці яго называлася Маргарытай, што на свет божы ён прыйшоў **у Вільні,** што сюды, **у Прагу** ён з бацькам і Сімяонкам прыехаў **з Вільні*** (Алег Лойка. Скарына на Градчанах); *Хатнімі, прывезенымі **з Полацка ў Прагу**, аказваецца і ручнік з народным арнаментам, на які аўтар «прымацаваў» свой герб, і вярэнька з накрыўкай* (Сяргей Панізнік. На цеціве рэха). У такім ужыванні сувязь гарадоў абагульняецца да сувязі народных культур.

Па-мастацку арыгінальна і ярка пра гэту сувязь/сузалежнасцрс сказаў Уладзімір Караткевіч у сваім эсэ «Вера ў сілу дабрыні, або сын Беларусі, сын Прагі», утварыўшы з гіпа-гіперанімічныасі онімамі *Беларусь* і *Прага*

ёмістую метанімічную перыфразу, якую вынес ў назву. Ёю выразна падкрэсліваецца прыналежнасць Скарыны дзвюм культурам. У большай меры ўсё ж беларускай: у тэксце эсэ гэтая перыфраза дапаўняецца лагічнымі азначэннямі, якія канкрэтызуюць «роднасныя адносіны» – *родны сын **Беларусі** і прыёмны сын **Прагі**.*

Канцэнтруюць гісторыка-культурную інфармацыю групы ўрбонімаў, якімі кадзіруюцца пэўныя этапы жыцця Ф. Скарыны за межамі Беларусі – вучоба, атрыманне навуковага тытула, пачатак кнігавыдавецкай дзейнасці, што разлічана на чытацкую дасведчанасць. Пры яе адсутнасці пералічаныя ўрбонімы толькі акрэсліваюць прастору Скарынавых падарожжаў, аднак хаваюць неразгаданым вобразную інтэрпрэтацыю гісторыка-культурнрbх фактаў і асобы Скарыны: *У Кракаве, Падуі, **Празе**, Мілане// Ніхто мяне словам благім не памяне.// Я сеяў у сэрцах людзей паспалітых,// У душах знявераных і знябытых* (Васіль Вітка. Беларуская калыханка). Асобна ці ў спалучэнні з такімі ўрбонімамі найменне *Прага* ўжываецца як сімвал аддаленасці Скарыны ад Беларусі, яго смутку па радзіме, што можа стылістычна падкрэсліваецца эмацыянальным проціпастаўленнем гэтых урбонімаў онімам беларускіх рэалій: *Мне віначэрпії Падуі, Кракава, **Прагі**// З сонечным сокам кубкі падносілі залатыя// Ды не маглі наталіць яны смагі// Так, як звычайны карэц, калі чэрпну маёй Палаты я* (Генадзь Бураўкін. Скарына).

Прадуктыўным спосабам асваення мастацкім мысленнем урбоніма *Прага* застаецца яго развіццё азначэннямі-эпітэтамі. Культурна-інфармацыйную функцыю выконваюць у мастацкіх і мастацка-публіцыстрbчных тэкстах лагічныя азначэнні *чэшская, гусіцкая, каталіцкая, вольная, далёкая.* Яны скіроўваюць на канкрэтныя, стылістычна і зместава значныя адзнакі аб'екта, абстрагуючыся ад усяго багацця вобразных зместаў. Імі падкрэсліваецца дзяржаўная прыналежнасць горада, асноўная рэлігія яго жыхароў, распаўсюджаны ў ім грамадскі рух, грамадская атмасфера, аддаленасць: *На славянскіх землях тады было толькі два універсітэты – у **чэшскай Празе** і ў польскім Кракаве* (Анатоль Клышка. Францыск Скрына...); *І ці стане чытаць ім, Скарынам, надрукаваную ў **каталіцкай Празе** кнігу праваслаўны князь Канстанцін Астрожскі?* (Алег Лойка. Францыск Скарына...).

Большую вобразна-стылістычную значнасць надаюць урбоніму *Прага* нетрадыцыйныя эпітэты, у іх пераважае індывідуальна-аўтарскі падыход да адлюстравання культурна-гістарычных падзей, праз якія акрэсліваецца вобраз Скарыны. Прыгажосць і велічнасць упадабанага першадрукаром горада перадае эпітэт *раскошны*: *Вякі пазнаю навобмацак: **Прага** рас-*

*кошная ўчора збірала гатоўна ў дарогу далёкую дзіўнага госця полацкага* (Сяргей Панізнік. Пад Млечным шляхам). На гасціннасць да чужынцаў указвае эпітэт *прыязны*: *У **Празе** прыязнай не знаю// Адзіноты невясёлай// А сэрца неспакойна ўсё ж бывае,// Б'ецца ад нязнанай мукі* (Станіслаў Шушкевіч. Скарына ў Празе). Адзінкавым у нашым аналізе ўяўляецца прыклад адмоўнай ацэначнасці гэтага ўрбоніма, выказанай вуснамі ідэйных праціўнікаў Скарыны. У паэме «Самота паломніцтва» Рыгор Барадулін ужывае вельмі эфектны эпітэт – *скамянелая* (Прага), у якім кантэкст рэалізуе і ўзаемаўзмацняе некалькі аказіянальных значэнняў: 'пабудаваны з каменя', 'непрыступны', 'непрабівальны', 'стрыманы ў эмоцыях', 'велічны, поўны самапавагі': *А тут гусіцкі ерэтык// Надрукаваць святыя кнігі// Пасмеў// Уперад ад Масквы// У Вільні, ў **скамянелай Празе**.*

Мае распаўсюджанне на Беларусі і традыцыйнае ў Чэхіі спалучэнне *Злата Прага* ці фанетычна асвоенае *Залатая Прага.* Абодва варыянты ўжывае ў сваім рамане-эсэ Алег Лойка. У аповесці для дзяцей «Скарына на Градчанах» ён стварае на аснове гэтага спалучэння вобразны паралелізм *золата* (даброты гасціннай, але няроднай Прагі) – *дыямент* (духоўнае багацце Радзімы). Такое вобразнае пераасэнсаванне ўключана ва ўнутраны маналог Скарыны, звернуты да дзяцей і карэлюе з выказаным у сваіх выданнях рэальным Скарынам узвышанага, арганічнага чалавеку замілавання да Бацькаўшчыны: *Сэрца маё баліць; мучыцца душа мая: прывёз я вас сюды ў **Залатую Прагу**, даўшы вам золата **Прагі** і забраўшы дыяменты радзімы, зямлю мілую, родную мову.* Уладзімір Караткевіч ва ўзгаданым ужо эсэ падае традыцыйны выраз у форме цытацыі, суадносячы свае меркаванні з магчымымі меркаваннямі Скарыны, злучаючы гістарычны і сучасны планы адным культурным стрыжнем: *Але **Прага**, несумненна, цудоўнейшая з гарадоў, у якіх яму даводзілася жыць. Не такая, як зараз, але, несумненна, ужо «**Залатая Прага**».*

У стылістычных мэтах беларускія пісьменнікі выкарыстоўваюць аманімічныя і паранімічныя адносіны ўрбоніма з апелятывамі. Напрыклад, Сяргей Панізнік узнаўляе забытае значэнне слова *прага* і праз яго тлумачэнне пераходзіць у культурнае вымярэнне гістарычных судачыненняў Скарыны і Прагі: *Але ж так званы культурны пласт ствараўся нашымі папярэднікамі не толькі на ўласным котлішчы, але і **за прагай**. Словам «**прага**» называлі даўнія славяне агароджаную жэрдкамі ўскраіну паселішча. І ўспомніўся горад з той жа назвай – **Прага чэшская** (бо існуе яшчэ і Прага ля Варшавы). Менавіта там здабываў слаўнавядомы палачанін першыя крупінкі ў мацярык нашай культуры* (Сяргей Панізнік. На цэціве часу). Па-мастацку ўвасобленыя эўрыстычныя звесткі больш ха-

рактэрныя празаічнаму тэксту. У паэтычных тэкстах абыгрываецца сэнсавая і рыфма-рытмічная асаблівасць літаратурных амонімаў і паронімаў: Стылістычны эфект ствараецца супастаўленнем урбоніма з узуальнымі апелятывамі, значэнне якіх здольнае дынамічна перадаць патэнцыяльна вобразную характарыстыку: *прага* 'моцнае жаданне', 'імкненне' ; *прагна* 'з моцным жаданнем', 'з нецярплівым чаканнем': *Хіліла да кнігі –* ***прага,****// Перад народам павіннасць.// З табою віталася* ***Прага,****// Чырванабровая Вільня* (Кастусь Жук. Францішку Скарыне); *Успомні час той, залатая* ***Прага,****// калі ў аздобе срэбраных бяроз// глядзела на цябе любоўна,* ***прагна****// Скарынава радзіма – Беларусь* (Мікола Федзюковіч. Споведзь); *Дарогаю Петраркі палачанін//* ***У Прагу з прагай*** *рупнасці прыйшоў,// Каб іх імёны потым спалучалі,// Нібы на храмах постаці крыжоў* (Рыгор Барадулін. Скарынавы сляды). Фармальнае падабенства оніма і апелятыва выклікае перанясенне і ўзаемадзеянне іх значэнняў, чым узбагачаецца вобразны змест, падкэсліваецца факт актыўнага супрацоўніцтва, узаемаразумення чалавека і горада, беларускай і чэшскай культур, іх спрыянне Скарыне ў яго самаадданай натхняльнай працы.

Ва ўжыванні ўрбоніма *Прага* беларускія пісьменнікі рэалізуюць не толькі яго сэнсавыя, але і фона-гукавыя асаблівасці (што адзначаецца аднак не часта). Напрыклад, у паэме Уладзіміра Скарынкіна «Астральны знак Скарыны» перадаецца гукавы эфект грамавых раскатаў, пра якія паведамляецца ў вершаваным лінейным радку: *Пасвіствае вецер, нібы акарына,//* ***Грукоча над Прагай раскацісты гром.****// У цеснай каморы Францішак Скарына// Штосьпіша і піша гусіным пяром.*

Урбонім *Прага* набывае вобразнае развіццё ў вытворным прыметніку *пражскі*, поліфункцыянальным у семантычным і прагматычным плане. Гэты прыметнік указвае на гістарычную асобу – паплечніка Яна Гуса, вучонага-рэфарматара Ераніма Пражскага, чыё імя ў беларускім мастацкім тэксце ўжываецца як сімвал грамадскага развіцця Прагі і Еўропы. Факт яго прапаведніцтва на Беларусі гусіцкіх ідэй выкарыстоўваецца для падкрэслення агульнасці духоўнага жыцця і культурна-гістарычнай прасторы еўрапейскіх народаў. Прыметнік *пражскі* стварае канкрэтна-гістарычны план вобразнага адлюстравання Прагі, што выяўляецца ў мінімальным кантэксце, спалучэнні з найменнямі гарадскіх рэалій: *пражская готыка, пражскія мяшчане, пражскія званы, пражскі магістрат, пражскі друкар і інш.* Аналагічную мастацкую функцыю выконвае этнонім *пражане.*

Ужыванне ўрбоніма *Прага* ў тэкстах беларускай мастацкай Скарыніяны актывізуецца ў 60-я гады XX ст., калі «навуковая і творчая грамад-

скасць нашай рэспублікі па-сур'ёзнаму пачала асэнсоўваць вобраз Скарыны як Першадрукара»[9] (дададзім: усходнеславянскіх земляў). У стылёвых адносінах такія мастацкія тэксты вызначаюцца рэалістычным, гістарычна-акрэсленым і/ці рамантычна-узнёслым адлюстраваннем асобы славутага беларуса, яго часу і культурна-біяграфічных рэалій. Аднак у мастацкім уяўленні вельмі важным паўстае факт вяртання Скарыны ў канцы свайго жыцця ў Прагу (дзе, мяркуюць, ён і памёр). У гэтым выпадку мастацкі тэкст і яго лексічныя сродкі вызначаюцца трагічнай напоўненасцю. Гэта заўважаюць самі пісьменнікі. Напрыклад, Мікола Арочка, прадстаўляючы чытачам сваю драматычную паэму «Судны дзень Скарыны» падкрэслівае: «Постаць Скарыны ўяўляецца мне велічна-трагічнай. Сродкамі драматычнай паэмы мне хочацца разгадаць і асэнсаваць не проста драматычныя моманты яго жыцця, яго тытанічнай працы, але і судны дзень яго, судны час»[10]. Тады ва ўрбоніме *Прага* мастацкі кантэкст канцэнтруе ўвагу на такіх адзнаках яго прагматычнага зместу, як вялікая адлегласць ад Радзімы, адсутнасць у Скарыны магчымасцей працягваць сваю выдавецкую дзейнасць, інтрыгі супраць яго з боку падданых Фердынанда I.

Развіццё беларускай мастацкай Скарыніяны, літаратурна-вобразная інтэрпрэтацыя ўрбоніма *Прага* як значнага тэкставага складніка адбываецца ў напрамку інтэлектуалізацыі, філасофскага заглыблення ў скарынаўскую эпоху, духоўнае жыццё і праблемы сучаснасці, што ўзмацняе культурна-гістарычную адзначанасць онімаў *Скарына* і *Прага.* Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што сярод 3 тысяч онімаў і вытворных ад іх лексічных сродкаў, ужытых у сваіх выданнях Скарынам[11], менавіта яго ўласнае імя, а таксама ўрбонімы *Прага* (узноўлены першадрукаром у складзе вытворнага прыметніка) і, безумоўна, *Полацк* вызначаюцца найбольшымі вобразна-стылістычныасі патэнцыямі ў беларускіх мастацкіх тэкстах, бо ўвасабляюць запаветны шлях беларускай культуры, злучаюць часы і народы.

---

[9] Падарожная кніжка Скарыны / Уклад. С. Панізнік, В. Дышыневіч. Мінск, 1990. С. 45.

[10] *Арочка, М.*: Судны дзень Скарыны: Фрэскі драматычнай паэмы // Полымя. 1988. № 11. С. 51.

[11] *Булыка, А. М., Жураўскі, А. І., Свяжынскі, У. М.*: Мова выданняў Францыска Скарыны. Мінск, 1990. С. 205; Слоўнік мовы Скарыны. Т. 3. Анамастыка і тапаніміка / Склад. У. В. Анічэнка. Мінск, 1994. С. 248.